Аляксандр Вабішчэвіч

Брэст

# Гісторыя і культура заходняй Беларусі і Ўсходняй Літвы (паўночна-усходніх зямель ІІ Рэчы Паспалітай) у сучаснай беларускай і польскай гістарыяграфіі

*History and culture of Western Belarus and Eastern Lithuania (the north-eastern territories of the Second Republic) in contemporary Belarusian and Polish historiography*

Працэсы грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, культурнага жыцця заходнебеларускіх зямель, якія на працягу 1921–1939 гг. знаходзіліся ў складзе Польскай дзяржавы, ужо не адно дзесяцігоддзе з’яўляюцца аб’ектам даследаванняў як беларускіх, так і польскіх гісторыкаў. Аднак толькі ў 1990-я гг. – пачатку XXI ст. гэтая праблематыка набыла якасна новы навукова-тэарэтычны ўзровень і ў Беларусі, і ў Польшчы.

Сучасны этап развіцця беларускай навукі, які разгортваецца ва ўмовах існавання з 1991 г. Рэспублікі Беларусь, выдзяляецца пазітыўнымі зменамі ў метадалогіі даследаванняў і навізной іх тэматычна-сюжэтных напрамкаў, выяўленнем і ўвядзеннем у навуковы абарот шэрагу масіваў крыніц. Новыя канцэптуальныя падыходы па заходнебеларускай праблематыцы знайшлі адлюстраванне ў асноўных калектыўных выданнях па гісторыі Беларусі.[1] У 5-м томе 6-томнай *Гісторыі Беларусі* пад рэдакцыяй акадэміка М. П. Касцюка на падставе шырокага кола крыніц выкарыстанне новых падыходаў адбываецца пры захаванні пераемнасці з лепшымі дасягненнямі беларускай савецкай гістарычнай навукі.[2]

Увядзенне ў навуковы абарот новых гістарычных крыніц, якія раней не былі даступнымі для вучоных, дазволіла ім прадоўжыць традыцыйныя і вызначыць новыя даследчыцкія напрамкі. У. Ф. Ладысеў ажыццявіў пераасэнсаванне гісторыі заходнебеларускага камуністычнага руху.[3] Наватарскім характарам вылуча-

1 *Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч, ч. 2,* Мінск 1995, с. 214–253; *Гісторыя Беларусі: у 2 ч., ч. 2,* пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля, Мінск 1998, с. 196–212.

2 *Гісторыя Беларусі: у 6 т., т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг.,* Мінск 2006, с. 352–448.

3 У. Ладысеў, *Іосіф Каэтанавіч Лагіновіч: нарыс жыцця і палітычнай дзейнасці,* „Беларускі гістарычны часопіс” 1996, № 3, с. 149–159; № 4, с. 164–175; У. Ф. Ладысеў, *Цяжкі шлях выпрабаванняў*, „Беларускі гістарычны часопіс” 1994, № 1, с. 85–86.

ецца сумесная манаграфія У. Ф. Ладысева і П. І. Брыгадзіна, у якой беларускае пытанне ў міжваеннай Польшчы разгледжана ў кантэксце завяршальнага этапу кансалідацыі беларускай нацыі.[4] Цэлы шэраг этнаканфесіянальных аспектаў жыцця заходнебеларускага грамадства адлюстраваны ў публікацыях П. І. Зялінскага. Навізной выдзяляюцца працы Р. Р. Лазько, у якіх закрануты этнапсіхалагічныя і суб'ектыўна-асобасныя фактары ў грамадскім жыцці Польшчы ў 1930-я гг. Паводле яго высноў, савецка-польская геапалітычная і ідэалагічная канфрантацыя аказала ўплыў на фарміраванне негатыўных стэрэатыпаў у грамадскай свядомасці палякаў і беларусаў, што адбілася на характары іх узаемаадносін.[5]

Праблемна-тэматычны дыяпазон даследаванняў па гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. пашыраны таксама ў шэрагу іншых навуковых прац беларускіх вучоных. У распрацаванай А. М. Вабішчэвічам навуковай канцэпцыі нацыянальна-культурнага жыцця ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. як цэласнай сістэмы існавання раз'яднанай часткі беларускай нацыі ў межах поліэтнічнай Польскай дзяржавы арганічна спалучаецца беларусацэнтрычны і поліэтнічны падыходы: аналізу падвергнуты беларусы (большасць насельніцтва), палякі, якія не мелі большасці сярод насельніцтва на тэрыторыі Заходняй Беларусі, аднак былі тытульным этнасам у Польскай дзяржаве, а таксама іншыя нацыянальныя супольнасці (яўрэі, рускія, украінцы, літоўцы, татары).[6] Супрацоўніцтва арганізацыі „Змаганне" з Таварыствам беларускай школы атрымала ўзважлівыя ацэнкі ў манаграфіі В. В. Даніловіча.[7] Дзейнасць маладзёжных, дабрачынных арганізацый, органаў мясцовага кіравання, парламенцкія формы барацьбы былі прадметам даследаванняў В. І. Крывуця, А. І. Пашковіч, А. І. Боркі, А. В. Пашкевіча.[8]

---

4 У. Ф. Ладысеў, П.І. Брыгадзін, *Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939),* Мінск 2003.

5 Р. Р. Лазько, *Еўрапейская палітыка Польшчы (1932–1939 гг.),* аўтарэф. дыс. … д-ра гіст. навук, Мінск 2001; Р. Лазько, *Перад патопам: еўрапейская палітыка Польшчы (1932–1939 гг.),* Мінск 2000, с. 34.

6 А. М. Вабішчэвіч, *Асвета ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.),* Брэст 2004; А. М. Вабішчэвіч, *Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.),* Брэст 2008; А. М. Вабішчэвіч, *Нацыянальна-культурнае жыццё ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)*, аўтарэф. дыс. … д-ра гіст. навук, Мінск 2010.

7 В. В. Даніловіч, *Дзейнасць арганізацыі „Змаганне" ў Заходняй Беларусі (1927–1930 гг.)*, Мінск 2007.

8 В. И. Кривуть, *Молодёжные организации на территории Западной Беларуси (1929–1939 гг.)*, автореф. дис. … канд. ист. наук, Минск 2005; В. И. Кривуть, *Молодежные организации на территории Западной Беларуси (1929–1939 гг.)*, Минск 2008; А. І. Пашковіч, *Дзейнасць дабрачынных арганізацый на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.*, аўтарэф. … дыс. канд. гіст. навук, Мінск 2008; А. І. Борка, *Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання і самакіравання ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.),* аўтарэф. … дыс. канд. гіст. навук, Мінск 2007; К. С. Разуванава, *Дзейнасць Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры ў Заходняй Беларусі (1926–1936 гг.),* аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук, Мінск 2011; А. В. Пашкевіч, *Парламенцкія формы змагання за нацыянальныя і сацыяльныя правы беларускага народа ў міжваеннай Польшчы (1921–1930 гг.),* аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук, Мінск 2006.

Этнаканфесіянальная палітыка польскіх улад у адносінах да беларускага насельніцтва даследавалася А. М. Загідуліным. Паводле яго заключэнняў, практычнай рэалізацыяй палітыкі займалася мясцовая адміністрацыя на ўзроўні павятовых старастаў і ніжэй.[9]

Улічваючы тое, што дамінуючыя пазіцыі выконваў дзяржаўна-палітычны фактар, накіраваны на асіміляцыю беларускага насельніцтва, В. Э. Рабышка разглядала праблемы этнакультурнай самаідэнтыфікацыі ва ўзаемасувязі з этнапалітычнымі працэсамі. Яе падлікі нацыянальнай структуры насельніцтва Заходняй Беларусі з'яўляюцца на цяперашні час найбольш верагоднымі ў беларускай гістарычнай навуцы.[10] Заслугоўваюць належнай ацэнкі намаганні Э. А. Мазько па вызначэнні ўплыву Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі на фарміраванне агульнай культурнай сітуацыі ў заходнебеларускім краі. Аднак нельга прызнаць яго перабольшванне ў гэтай справе фактара канкурэнцыі беларускай і польскай культур[11], бо ў рэальнасці ў беларуска-польскіх міжкультурных адносінах не было парытэтнага, паўнавартаснага саперніцтва.

Тэматычнай навізной вылучаюцца працы, прысвечаныя культурнаму жыццю асобных нацыянальных супольнасцей. Дзейнасці рускіх арганізацый і іх узаемаадносінам з праваслаўнай царквой прысвечаны даследаванні В. М. Чарапіцы і В. Р. Швайко.[12] В. Р. Швайко вылучыла сярод рускага насельніцтва толькі 2 групы – эмігрантаў і прадстаўнікоў рускай нацыянальнай меншасці, зыходзячы найперш ад рознасці іх прававога становішча, ідэйна-палітычных разыходжанняў і іншых крытэрыяў. У адрозненне ад эмігрантаў (мігрантаў з усходу), да рускай меншасці аднесена толькі частка карэннага рускага насельніцтва на заходнебеларускіх землях. Наогул не з'яўлялася прадметам вывучэння адна з прыкметных этнаканфесіянальных груп насельніцтва – стараабраднікі. У публікацыях І. Б. Канапацкага, Л. М. Лыча грамадска-культурнае жыццё татараў заходнебеларускіх зямель у адзначаны храналагічны перыяд асобна не вылучалася, разглядалася толькі ў агульным кантэксце этнакультурных працэсаў у Беларусі. Асобныя звесткі пра яўрэйскія абшчыны, прадстаўнікоў інтэлігенцыі з заходнебеларускіх гарадоў і мястэчак прыведзены ў працах Э.Р. Іофэ. Дзейна-

[9] А. М. Загідулін, *Нацыянальная і канфесіянальная палітыка польскіх улад у адносінах да беларускага насельніцтва Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)*, аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук, Мінск 2005, с. 11; А. М. Загідулін, *Беларускае пытанне ў польскай нацыянальнай і канфесійнай палітыцы ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.),* Гродна 2010.

[10] В. Э. Рабышка, *Этнапалітычныя працэсы ў Заходняй Беларусі ў 1919–1939 гадах,* аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук, Мінск 2004.

[11] Э. А. Мазько, *Уплыў Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі на фармаванне культурнай сітуацыі ў Заходняй Беларусі ў 20–30-я гады XX ст.,* аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук, Гродна 2003, с. 10.

[12] В. Н. Черепица, *Очерки истории православной церкви на Гродненщине (с древнейших времён до наших дней):* в 2 ч., ч. 1, Гродно 1999, ч. 2, Гродно 2005; В. Г. Швайко, *Деятельность русских организаций в Польше по сохранению русской культуры в 1921–1939 гг.,* автореф. дис. …канд. ист. наук, Гродно 2005.

сць яўрэйскіх партый і арганізацый на тэрыторыі Заходняй Беларусі вывучалі А. В. Машчук, П. Т. Стацкевіч.[13]

Прадметам навуковых даследаванняў беларускіх вучоных пакуль не была дзейнасць палякаў у заходнебеларускім краі ў 1920–30-я гг. Асобныя метадалагічныя пазіцыі адносна польскай супольнасці выкладзены ў манаграфіі А. Ф. Смалянчука, аднак вышэйшай храналагічнай мяжой яго даследавання з'яўляўся пачатак XX ст.[14] Дзейнасць польскіх партый і арганізацый у заходнебеларускім рэгіёне даследавалася А. К. Гецэвічам.[15]

У абставінах ажыўлення інтарэсу сучаснай беларускай грамадскасці да нацыянальных гісторыка-культурных каштоўнасцей і іх лёсу актуальнымі і наватарскімі па тэматыцы сталі даследаванні па музеязнаўстве, краязнаўчай дзейнасці А. А. Гужалоўскага, І. У. Цітовіча.[16] У манаграфіі В. А. Лабачэўскай народнае мастацтва і промыслы Заходняй Беларусі разглядаюцца як частка агульнанацыянальнай мастацкай культуры.[17] У далейшых даследаваннях патрабуецца вывучэнне дзейнасці шэрагу польскіх і беларускіх грамадскіх арганізацый навуковага профілю.

Улічваючы адносна высокі ўзровень рэлігійнасці заходнебеларускага насельніцтва і яго поліканфесіянальны склад у 1921–1939 гг., карыснымі з'яўляюцца асобныя сучасныя гісторыка-рэлігіязнаўчыя працы, сярод якіх вылучаецца калектыўная манаграфія пад рэдакцыяй У. І. Навіцкага, дзе зроблены агульны агляд канфесіянальнага жыцця ў Заходняй Беларусі.[18] Пытанні дзяржаўна-канфесіянальных адносін, дзейнасці асобных хрысціянскіх царкоўных структур разглядаліся беларускімі гісторыкамі ў шэрагу прац.[19] Аднак прадмет гэтых

---

13 А. В. Мощук, *Деятельность Бунда на территории Западной Беларуси в 1921–1939 гг.*, автореф. дис. … канд. ист. наук, Минск 2008; П. Т. Стецкевич, *Деятельность еврейских политических партий и организаций на территории Западной Беларуси (1918–1926 гг.)*, автореф. дис. … канд. ист. наук, Минск 2008.

14 А. Смалянчук, *Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г.* С.-Пецярбург 2004.

15 А. К. Гецевич, *Деятельность польских политических партий и организаций в Западной Беларуси (1918–1926 гг.),* автореф. дис. … канд. ист. наук, Минск 2007.

16 А. А. Гужалоўскі, *Музеі Беларусі (1918–1941 гг.),* Мінск 2002; А. А. Гужалоўскі, *Станаўленне і развіццё музейнай справы Беларусі (1918–1941 гг.),* аўтарэф. дыс. … д-ра гіст. навук, Мінск 2002; І. У. Цітовіч, *Краязнаўчы рух на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)*, аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук, Мінск 2006.

17 В. А. Лабачэўская, *Зберагаючы самабытнасць: з гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі,* Мінск 1998.

18 *Канфесіі на Беларусі (канец XVIII–XX ст.),* навук. рэд. У. І. Навіцкі, Мінск 1998, с. 199–216.

19 І. І. Трацяк, *Культурна-асветніцкая дзейнасць беларускіх каталіцкіх святароў (пачатак XX ст. – 1939 г.),* аўтарэф. дыс. … канд. культуралогіі, Гродна 2000; А.Н. Свирид, *Униатская церковь в Западной Беларуси (1921–1939 гг.)*, Брест 2012; А.Г. Цымбал, *Палітыка польскіх улад у адносінах да праваслаўнай царквы ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)*, аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук, Мінск 2009; Т.В. Лисовская, *Неопротестантизм в Западной Беларуси в 1921–1939 гг.,* автореф. дис. … канд. ист. наук, Минск 2009.

даследаванняў абмежаваны пераважна праблематыкай адной канфесіі, што не дазваляе зрабіць цэласнае ўяўленне пра іх становішча, характар узаемаадносін, эвалюцыю дзяржаўна-канфесіянальных адносін.

Хоць праблематыка паўночна-ўсходніх зямель ІІ Польскай Рэчы Паспалітай (менавіта такая дэфініцыя заходнебеларускай тэрыторыі замацавана цяпер у польскім навуковым друку) распрацоўвалася ў ПНР, аднак у постсацыялістычнай Польшчы яна набыла большую тэматычную разнастайнасць, тэарэтычнае асэнсаванне. Для польскіх гісторыкаў істотна аблегчыўся доступ да дакументаў, што захоўваюцца ў архіўных установах Рэспублікі Беларусь. У 1990-я гг. актывізавалася супрацоўніцтва беларускіх і польскіх даследчыкаў у ходзе навуковых канферэнцый і семінараў, пры выданні навуковай і навукова-папулярнай літаратуры. Сумеснымі намаганнямі рабіліся спробы прааналізаваць польска-беларуска-літоўскія адносіны ў 20–30-я гг. ХХ ст. Адначасова трэба адзначыць некаторы ўплыў на польскую гістарычную думку спроб ідэалізацыі асобных бакоў жыцця міжваеннай Польшчы, асабліва ў сродках масавай інфармацыі.

У манаграфіі К. Гамулкі[20] быў выкладзены цэласны (аднак павярхоўны) погляд на беларускае пытанне ў міжваеннай Польшчы. Пры ацэнцы ўрадавай нацыянальнай палітыкі абгрунтоўвалася палажэнне не аб паланізацыі, як сцвяржалася раней, а аб асіміляцыі беларусаў. Аднак тэзіс К. Гамулкі аб слабой каштоўнасці заходнебеларускай інтэлігенцыі быў запазычаны з тэндэнцыйных і суб'ектыўных ацэнак польскай адміністрацыі, што прысутнічаюць у архіўных крыніцах. Беларускамоўныя выданні, творчасць асобных заходнебеларускіх дзеячаў былі прадметам вывучэння Ю. Туронка.[21] Становішча беларусаў і асобных нацыянальных супольнасцей, іх грамадская дзейнасць раскрыты ў аглядавым плане ў працах Р. Дамброўскага, М. Іваніцкага, Я. Тышкевіча.[22]

Навуковую вартасць маюць этнадэмаграфічныя працы П. Эберхардта[23], у якіх прапанаваны аўтарскія падлікі колькасці насельніцтва кожнай з нацыянальных супольнасцей у паўночна-заходніх землях ІІ Польскай Рэчы Паспалітай. Прызнаючы наватарскі характар даследавання П. Эберхардта па этнадэмаграфічнай статыстыцы, ацэньваючы ў якасці найбольш верагоднай колькасць асобных нацыянальных супольнасцей (яўрэяў, рускіх, украінцаў, літоўцаў), нельга прызнаць навукова абгрунтаванай яго методыку вызначэння колькасці беларусаў і палякаў. Пры падліках беларусаў ім у аснову пакладзены прынцып веравызнання; выключаны некаторыя паветы (Саколкаўскі, Беластоцкі, Аўгу-

20 K. Gomółka, *Białorusini w II Rzeczypospolitej,* Gdańsk 1992.

21 E. Turonek, *Książka białoruska w II Rzeczypospolitej 1921–1939,* Warszawa 2000.

22 R. Dąbrowski, *Działalność społeczno-gospodarcza i kulturalna mniejszości narodowych w II Rzeczypospolitej (1918–1939),* Szczecin 1990; M. Iwanicki, *Ukraińcy, Białorusini, Litwini i Niemcy w latach 1918–1990*, Siedlce 1991; J. Tyszkiewicz, *Z historii Tatarów polskich 1794–1944,* Pułtusk 2002.

23 П. Эберхард, *Дэмаграфічная сітуацыя на Беларусі: 1897–1989*, Брэст 1997; P. Eberhardt, *Polska ludność kresowa: rodowód, liczebność, rozmieszczenie,* Warszawa 1998; P. Eberhardt, *Przemiany narodowościowe na Białorusi*, Warszawa 1994.

стоўскі – у Беластоцкім ваяводстве, Ашмянскі, Віленска-Трокскі і Свянцянскі, якія ў 1920–1922 гг. уваходзілі ў склад Цэнтральной Літвы, а потым былі ўключаны ў Віленскае ваяводства).

Большы акцэнт на даследаванне гісторыі і культуры заходнебеларускіх зямель робіцца польскімі даследчыкамі ў Беластоку. Новымі метадалагічнымі падыходамі вылучаюцца манаграфіі, артыкулы Я. Мірановіча, біяграфічныя нарысы аб прадстаўніках заходнебеларускай інтэлігенцыі А. Глагоўскай і іншых польскіх гісторыкаў, беларусаў па паходжанні.[24]

Комплекс пытанняў, звязаных з функцыянаваннем у заходнебеларускім краі польскіх органаў дзяржаўнай адміністрацыі і апарата бяспекі, адлюстраваны ў працах В. Сляшынскага.[25] На яго думку, заходнебеларускія землі былі на перыферыі эканамічнага жыцця Польшчы, таму памылковасць і заганнасць нацыянальнай палітыкі польскіх улад яскрава праявілася ў верасні 1939 г. Нягледзячы на наяўнасць новых канцэптуальных падыходаў, звязаных з ацэнкай дзейнасці польскіх органаў бяспекі, В. Сляшынскі выкарыстаў традыцыйную для польскай гістарыяграфіі кваліфікацыю нацыянальнай палітыкі ІІ Польскай Рэча Паспалітой (нацыянальная і дзяржаўная кансалідацыя) у адрозненне ад той, якая існуе ў беларускай гістарычнай навуцы (нацыянальная і дзяржаўная асіміляцыя), разглядаў некаторыя бакі грамадскага жыцця беларусаў выключна ў кантэксце адпаведнасці іх ці разыходжання з тагачаснымі польскімі дзяржаўнымі і нацыянальнымі інтарэсамі. Вроцлаўскі даследчык П. Ціхарацкі даследаваў заблытаны і супярэчлівы, драматычны і „дэманізаваны" жыццяпіс палескага ваяводы В. Костэк-Бярнацкага.[26] Палітычнае жыццё ў паўночна-ўсходніх землях міжваеннай Польшчы асветлена ў манаграфіі Э. Кірвель з Любліна.[27]

Аналізуючы даследаванні па заходнебеларускай праблематыцы, варта адзначыць некаторыя канцэптуальныя разыходжанні ў працах беларускіх і польскіх гісторыкаў, а таксама захады ў напрамку збліжэння пазіцый. Па-першае, існуюць розныя паняцці для азначэння тэрыторыі Заходняй Беларусі, выкарыстоўваюцца неаднолькавыя лічбавыя паказчыкі яе плошчы, колькасці насельніцтва, яго нацыянальнага і канфесіянальнага складу. Аднак сярод беларускіх

[24] Я. Мірановіч, *Навейшая гісторыя Беларусі*, Беласток 1999; E. Mironowicz, *Białorusini i Ukraińcy w polityce obozu piłsudczykowskiego,* Białystok 2007; Я. Мірановіч, *Беларусы ў Польшчы (1918–1949 гг.),* Вільня-Беласток 2010; H. Głogowska, *Autobiografia Piotra Sierhijewicza,* „Białoruskie Zeszyty Historyczne" 2000, № 14, s. 195–207 і інш.

[25] W. Śleszyński, *Walka instytucji państwowych z białoruską działalnością dywersyjną 1920–1925,* Białystok 2005; В. Сляшыньскі, *Нацыянальная палітыка польскіх улад на землях Усходняй Літвы і Заходняй Беларусі,* „Беларускі гістарычны часопіс" 2006, № 9, с. 9–15; W. Śleszyński, *Bezpieczeństwo wewnętrzne w polityce państwa polskiego na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej,* Warszawa 2007.

[26] P. Cichoracki, *Droga ku anatemie: Wacław Kostek-Biernacki (1884–1957),* Warszawa 2009.

[27] E. Kirwiel, *Kresy Północno-Wschodnie Rzeczypospolitej Polskiej w latach 1918–1939: Oblicze polityczne*, Lublin 2011.

даследчыкаў пашыраецца разуменне тэрміна **Заходняя Беларусь** у якасці геаграфічнага, а не палітычнага, звязанага з арэалам дзейнасці Кампартыі Заходняй Беларусі.[28] У сваю чаргу ў працах сучасных польскіх вучоных выкарыстоўваецца пераважна паняцце **паўночна-ўсходнія землі II Рэчы Паспалітай**, а **крэсы**, **крэсовасць** усё часцей разглядаюцца ў межах цывілізацыйнага падыходу (пры гэтым у публіцыстыцы, мемуарнай літаратуры гэтыя паняцці нярэдка выкарыстоўваюцца ў якасці этнапалітычных). Па-другое, назіраюцца ацэнкі становішча заходнебеларускіх зямель з пазіцыі дзяржаўных ці нацыянальных інтарэсаў міжваеннага часу. Напрыклад, знаходжанне Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы падаецца ў якасці „меншага зла" у параўнанні з савецкай Беларуссю ва ўмовах сталінскай таталітарнай сістэмы. Калі ў беларускай гістарыяграфіі заходнебеларускі рух трактуецца пераважна ў якасці нацыянальна-вызваленчага, то ў працах польскіх аўтараў яго нярэдка кваліфікуюць антыдзяржаўнай, падрыўной дзейнасцю. Па-трэцяе, па-рознаму ацэньваецца польская супольнасць у заходнебеларускім краі. Пазіцыя беларускіх і большасці польскіх даследчыкаў заключаецца ў тым, што палякі з'яўляліся там аўтахтонным этнасам, але павелічэнне іх колькасці адбывалася за кошт паланізацыі і самапаланізацыі мясцовага насельніцтва, пры наяўнасці нязначнага фактару каланізацыі. Апошнія даследаванні беларускіх і польскіх даследчыкаў (А. М. Вабішчэвіча, А. М. Загідуліна, Я. Мірановіча, В. Сляшынскага і інш.) пацвердзілі асіміляцыйна-абмежавальную накіраванасць і адначасова незавершаны характар нацыянальнай палітыкі польскіх уладаў.

Нягледзячы на тое, што дадзены аналіз гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі абмежаваны храналагічным перыядам ад Рыжскага мірнага дагавору 1921 г. да пачатку Другой сусветнай вайны 1 верасня 1939 г., аднак варта ўзгадаць цэлы шэраг іншых разыходжанняў прынцыповага характару, якія закранаюць складаныя і драматычныя старонкі беларуска-польскіх адносін – у час савецка-польскай вайны 1919–1920 гг., у ходзе ўваходжання заходнебеларускага рэгіёну ў склад БССР, правядзення там пераўтварэнняў на савецкай аснове з верасня 1939 г. да чэрвеня 1941 г. і інш., што заслугоўваюць асобнага гістарыяграфічнага даследавання.

У цэлым, разгорнуты ў 1990-я гг. дыялог беларускай і польскай гістарычных навук патрабуе на сучасным этапе істотнага ажыўлення, змястоўнага напаўнення, узаемапаважлівага стаўлення і збліжэння канцэптуальных падыходаў. Усебаковы навуковы погляд на заходнебеларускую праблематыку, які пазбаўлены палітычнай і ідэалагічнай кан'юнктуры, нацэлены на садзейнічанне канструктыўнаму характару сувязей вучоных Беларусі і Польшчы пры правядзенні сумесных даследаванняў, што ў канечным выніку павінна спрыяць развіццю добрасуседскіх адносін паміж беларускім і польскім народамі.

[28] У. Міхнюк, *Заходняя Беларусь: граніцы, тэрыторыя і насельніцтва*, „Беларускі гістарычны часопіс" 2004, № 11, с. 14–16.

**Summary**

The author takes a stance on the studies by contemporary Belarusian and Polish scholars, devoted to the history and culture of the territories of Western Belarus and Eastern Lithuania, which were part of Poland in 1921–1939. The article acknowledges positive changes in research methodology, and points to the expansion of the subject and introduction of new sources into scholarly circulation. The author believes that there are still essential differences between the views of Belarusian and Polish historians. Recently, however, their views and concepts are gradually becoming closer to one another.